**Ю.А.Пераверзева,** *старшы выкладчык*

# ПРАЕКТНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ПУБЛІЧНЫХ БІБЛІЯТЭК: САЦЫЯЛЬНА-ПЕДАГАГІЧНЫ АСПЕКТ

Праектная дзейнасць бібліятэк уяўляе сабой сістэму інавацыйнага развіцця сацыяльна значных формаў і метадаў бібліятэчнай работы з прыцягненнем пазабюджэтных рэсурсаў. Яна рэалізуецца ў комплексе бібліятэчнага фандрэйзінгу праз распрацоўку і ўкараненне бібліятэчных праектаў і мэтавых праграм.

Бібліятэчны праект – гэта сістэма мерапрыемстваў сацыяльнага, адукацыйнага, выхаваўчага характару, закліканых удасканаліць дзейнасць бібліятэк у сферах абслугоўвання карыстальнікаў, павышэння прафесійнага ўзроўню бібліятэкараў, прымянення бібліятэчна-інфармацыйных тэхналогій і рэсурсаў. Мэтавая бібліятэчная праграма ўяўляе сукупнасць паслядоўных праектаў, якія аб’яднаны агульнай мэтай і маюць сістэмную, комплексную накіраванасць [2].

Ва ўмовах шматфункцыянальнасці бібліятэчнай дзейнасці праектаванне разглядаецца як фактар, які садзейнічае пераўтварэнню бібліятэчнага асяроддзя і самавызначэнню бібліятэкі ў залежнасці ад сацыяльна-дэмаграфічных працэсаў тэрыторый.

Дасягненне пазітыўных змяненняў сацыяльнага асяроддзя з дапамогай бібліятэчнага праектавання магчыма пры развіцці ўзаемадзеяння бібліятэкі з грамадскасцю ў выглядзе арганізаваных формаў актыўнасці бібліятэкараў. Пры гэтым да ўвагі павінны прымацца не толькі прафесійныя веды і навыкі бібліятэкараў, але і сацыяльны вопыт, псіхолага-педагагічная падрыхтаванасць, інтэлектуальныя здольнасці і гібкасць мыслення, мэтанакіраванасць, матывацыя да дасягнення прафесійнай паспяховасці і інш.

Праектная дзейнасць пэўным чынам уплывае на трансфармацыю асноўных функцый бібліятэк. У гэтым сэнсе культурна-асветніцкая функцыя выяўляецца ў адлюстраванні ў інфармацыйных рэсурсах гісторыка-культурнай спадчыны рэгіёну, што садзейнічае павышэнню ўвагі грамадскасці да праблем захавання і трансляцыі народных традыцый, рэалізацыі культурных праграм, дзейнасці ў кантэксце культурнай разнастайнасці. У краіне ўжо накоплены вопыт работы публічных бібліятэк у гэтым напрамку. Вядомы бібліятэчныя мэтавыя праграмы “Традыцыйная культура і дзеці:

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

праблемы захавання і пераемнасці”, “Духоўнае адраджэнне”, “Памяць бацькоўскай зямлі”. Змястоўнае напаўненне падобных праграм грунтуецца на педагагічным уздзеянні на чытачоў сродкамі прыказак і прымавак, жартаў, звычаяў, абрадаў, мастацкіх элементаў фальклору, нацыянальных касцюмаў, рэгіянальных дыялектаў мовы.

У стварэнні ўласных бібліяграфічных матэрыялаў і электронных баз даных праяўляецца інфармацыйная функцыя бібліятэк. Падчас рэалізацыі мэтавых праграм “Жывая памяць Гомельшчыны” і “Жывая памяць Міншчыны” сабраны унікальны фонд краязнаўчых дакументаў на сучасных носьбітах, што дазваляе бібліятэкам весці шырокую асветніцкую работу сярод насельніцтва. Ствараюцца базы даных “Наследие Гомельщины”, “Памяць Міншчыны”, “Край мой – Магілёўшчына”. Вылучаюцца і друкаваныя выданні, напрыклад, “Легенды і паданні Уздзеншчыны”, “Аб чым гаворыць назва”, “Памяць зніклых вёсак” [1].

Рэалізацыя адукацыйнай функцыі публічных бібліятэк сродкамі мэтавых праграм і бібліятэчных праектаў забяспечваецца выкарыстаннем традыцыйных і інвацыйных формаў прадастаўлення інфармацыі і стварэннем магчымасці навучання, самаадукацыі ўсіх катэгорый карыстальнікаў. Бібліятэкі забяспечваюць доступ да аддаленых адукацыйных рэсурсаў і мультымедыйных матэрыялаў, электронных каталогаў.

Праектная дзейнасць разумеецца і як сродак павышэння кваліфікацыі бібліятэчных спецыялістаў. Яе арганізацыю мэтазгодна ажыццяўляць з улікам патрэбнасці фарміравання базавай кампетэнтнасці бібліятэкараў. Бібліятэчнае праектаванне як педагагічная тэхналогія прадугледжвае групавую работу, арганізацыю ролевай актыўнасці і камунікацыі, развіццё невербальных зносін, адпрацоўку тэхналогіі ацэнкі паспяховасці бібліятэчнага праекта ці праграмы.

Адукацыя ў галіне бібліятэчнага праектавання павінна арыентавацца на прынцыпы андрагогікі і ўтрымліваць такія характарыстыкі, як варыятыўнасць зместу праграм навучання, індывідуалізацыя навучання згодна сацыяльна-дэмаграфічным асаблівасцям і спецыяльным навыкам навучэнцаў, дынамізм вучэбнага працэсу, суб’ект-аб’ектнае ўздзеянне ў межах адукацыйнай сітуацыі, стымуляванне да атрымання грамадска карысных вынікаў работы.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

Педагагічны патэнцыял бібліятэчных праектаў і мэтавых праграм накіраваны на сацыялізацыю іх удзельнікаў, свядомую адаптацыю да рэчаіснасці, фарміраванне ўменняў эфектыўнага ўзаемадзеяння з навакольным асяроддзем. Магчыма вылучэнне бібліятэчных праектаў па дамінуючай дзейнасці выканаўцаў (творчыя, ролевыя); уздзеянні на ўдзельнікаў (сацыялізуючыя, адаптацыйныя, выхаваўчыя, адукацыйныя); накіраванасці (прафілактычныя, тлумачальныя, навукова-даследчыя, практыка-арыентаваныя); тэматыка-змястоўнай прымеце (інфармацыйныя, рэкрэацыйныя).

Як сведчыць вопыт рэалізацыі бібліятэчных праектаў і мэтавых праграм, існуе пэўная дынаміка гэтай дзейнасці. Разгледзім яе на прыкладзе публічных бібліятэк Мінскай вобласці.

У 2003–2007 гг. публічнымі бібліятэкамі Міншчыны было распрацавана і рэалізавана 233 бібліятэчных праектаў і мэтавых праграм. Для разглядаемага перыяду характэрна адносная стабільнасць праектнай дзейнасці (мал. 1).




Мал. 1. Колькасць бібліятэчных праектаў і мэтавых праграм, рэалізаваных публічнымі бібліятэкамі Міншчыны за 2003–2007 гг.

Разам з тым у практыцы праектавання пераважаюць мэтавыя бібліятэчныя праграмы. Магчыма гэта тлумачыцца патрэбнасцю бібліятэкі да цэласнага і шматаспектнага раскрыцця пэўнай праблематыкі, неабходнасцю канцэнтрацыі рэсурсаў бібліятэчнага абслугоўвання, развіццём партнёрскіх адносін, магчымасцю выкарыстання інфармацыйна




БИБЛИОТЕКА БГУКИ

-камунікацыйных тэхналогій (мал. 2).

Мал. 2. Дынаміка колькасных змяненняў бібліятэчных праектаў і мэтавых праграм

Гэтыя абставіны адлюстроўваюць не толькі сацыяльна-культурны і педагагічна-выхаваўчы патэнцыял бібліятэчнага праектавання, але і характарызуюць яго з сістэмна-змястоўных пазіцый практычнага ўвасаблення. Так, праектная дзейнасць можа разглядацца як:

– самастойная бібліятэчная работа па вывучэнні сацыяльных груп абанентаў і прадастаўленні адпаведнай інфармацыі, аказанні паслуг па выхаванні, навучанні і развіцці;

– суправаджэнне сацыяльна-педагагічнай дзейнасці спецыялізаваных устаноў і асобных спецыялістаў па стварэнні адукацыйна-выхаваўчай прасторы і аказанні сацыяльна-педагагічнай дапамогі розным катэгорыям насельніцтва;

– інтэграцыйная дзейнасць розных інстытутаў грамадства, накіраваная на рэалізацыю праектаў і праграм сацыяльнай абароны і адаптацыі, матэрыяльнай падтрымкі, арганізацыі культурна-адпачынкавай дзейнасці.

Найбольш распаўсюджанай тэматыкай бібліятэчных праектаў і мэтавых праграм публічных бібліятэк Мінскай вобласці з’яўляюцца культурна-асветніцкая дзейнасць, экалагічная адукацыя і выхаванне, абслугоўванне сацыяльна неабароненых катэгорый карыстальнікаў, прапаганда здаровага ладу жыцця, краязнаўства і іншыя (мал. 3).




Мал. 3. Асноўная тэматыка бібліятэчных праектаў і мэтавых праграм

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

Дзейнасць публічных бібліятэк Беларусі сугучная сацыяльна-эканамічным прынцыпам развіцця сучаснага грамадства. Яна характарызуецца актыўным выкарыстаннем інфармацыйных тэхналогій, інтэнсіўнай інтэграцыяй у сацыякультурнае асяроддзе, аказаннем сацыяльнай падтрымкі такім групам карыстальнікаў, як моладзь, інваліды, састарэлыя людзі, малазабяспечаныя сем'і. Таму новыя формы работы бібліятэк, праектная дзейнасць у тым ліку, даюць магчымасць пашырэння функцый публічных бібліятэк, спрыяюць сацыяльнай інтэграцыі грамадства, развіццю перспектыўных кірункаў бібліятэчнага абслугоўвання, рэалізацыі асветніцкіх задач, актывізацыі дабрачыннай дзейнасці.

___________


1. *Кірухіна, Л.Г.* Самабытная спадчына нацыі: публічная бібліятэка як захавальніца народных традыцый: тэарэтыка-метадычны аспект / Л.Г.Кірухіна; Нац. б-ка Беларусі. – Мн., 2005. – С. 8–20.

2. *Пераверзева, Ю.А.* Змястоўна-арганізацыйныя аспекты падрыхтоўкі работнікаў школьных бібліятэк да выкарыстання пазабюджэтнага фінансавання / Ю.А.Пераверзева // Веснік адукацыі. – 2008. – № 1. – С. 58–63.


БИБЛИОТЕКА БГУКИ